*Лашук І. В.,*

кандыдат сацыялагічных навук, дацэнт,
намеснік дырэктара па навуковай рабоце
ДНУ «Інстытут сацыялогіі
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»

# ДЫНАМІКА СТРАТЭГІЙ ПАВОДЗІН У ВОЛЬНЫ ЧАС САЦЫЯЛЬНА-ДЭМАГРАФІЧНЫХ І ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫХ ГРУП БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСТВА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адной з задач навукова-даследчага праекта «Вывучыць дынаміку культурных арыентацый і стратэгій сацыякультурных паводзін тэрытарыяльных і сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва Рэспублікі Беларусь па розных напрамках культуры», якое ажыццяўляецца па заказу Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца вывучэнне стратэгій спажывецкіх паводзін на рынку культурных тавараў і паслуг. Для яе вырашэння аўтарскім калектывам праекта ў 2013—2014 гг. быў праведзены параўнальны аналіз стратэгій адпачынкавых паводзін па наступных асноўных індыкатарах:

1) формы адпачынкавых практык (фактычныя / пажаданыя);
2) мэтавыя ўстаноўкі;
3) стратэгіі паводзін, у якіх рэалізуюцца адпачынкавыя практыкі (наведванне ўстаноў культуры, спорту);
4) эканамічныя стратэгіі паводзін адносна выбару форм адпачынкавых практык.

Эмпірычнай базай параўнальнага аналізу з'явіліся даныя сацыялагічных даследаванняў, праведзеных ДНУ «Інстытут сацыялогіі НАН Беларусі» ў 2013 і 2014 гг. па выбарках, рэпрэзентатыўных па полу, узросту, узроўню адукацыі, тыпу населенага пункта і рэгіёну пражывання. Генеральнай сукупнасцю праведзеных даследаванняў з'яўляецца насельніцтва Рэспублікі Беларусь ад 16 гадоў і больш.

У эмпірычных замерах была выкарыстана тэрытарыяльная (маршрутная) выбарка з праверкай квот, у якой вылучаюцца наступныя ступені:

1-я ступень — стратыфікацыя па абласцях (6 абласцей рэспублікі і г. Мінск);

2-я ступень — стратыфікацыя па тыпу населенага пункта (гарадское насельніцтва — сельскае насельніцтва);

3-я ступень — стратыфікацыя па зонах. Крытэрыем стратыфікацыі выбаркі выступала колькасць насельніцтва, што пражывае ў горадзе ці пасёлку гарадскога тыпу (для сельскіх жыхароў — бліжэйшы горад ці пасёлак гарадскога тыпу). У працэсе пабудовы выбаркі насельніцтва рэспублікі разбівалася на 5 зон, у якія ўваходзілі гарады з насельніцтвам:

больш за 250 тыс. жыхароў;

ад 100 да 250 тыс.;

ад 50 да 100 тыс.;

ад 10 да 50 тыс.;

менш за 10 тыс. жыхароў;

4-я ступень — адбор па прынцыпу гнездавой выбаркі (выбарачна адбіраюцца канкрэтныя населеныя пункты ў вызначаных вышэй стратах);

5-я ступень — адбор кватэры (дома), дзе праводзіцца апытанне рэспандэнта з ужываннем маршруту. Маршрутныя абмежаванні (крок адбору) вызначаюцца тыпам і памерам населенага пункта (чым большы населены пункт, тым большы крок).

На апошняй ступені адбору праводзіцца кантроль квот (для забеспячэння рэпрэзентатыўнасці выбарачнай сукупнасці). У якасці прымет у даследаванні выступаюць пол, узрост і адукацыя. Крыніцай інфармацыі аб сацыяльна-дэмаграфічных характарыстыках насельніцтва з’яўляюцца даныя, атрыманыя ў ходзе перапісу насельніцтва рэспублікі ў 2009 г. Выбарачная сукупнасць у 2014 г. склала 2000 чалавек, у 2013 г. — 1545 рэспандэнтаў. Звернем увагу на дынаміку фактычных і пажаданых адпачынкавых практык рэспандэнтаў. Для вызначэння фактычных стратэгій адпачынкавых паводзін рэспандэнтам прапаноўвалася адказаць на пытанне «Як Вы звычайна праводзіце вольны час?». Атрыманыя даныя сведчаць: у разглядаемы перыяд структура фактычных адпачынкавых практык не змянілася; разам з тым зафіксавана, што значна павялічылася колькасць людзей, якія праводзяць свой вольны час у інтэрнэце (гл. мал. 1).




*Мал. 1.* Дынаміка фактычных адпачынкавых практык па гадах



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Трэба заўважыць, што адзначаецца павышэнне, хоць і нязначнае, актыўнасці жыхароў Беларусі ў правядзенні вольнага часу. Так, рэспандэнты больш сталі займацца любімай справай, самаадукацыяй, удзельнічаць у грамадскіх мерапрыемствах, наведваць установы культуры. Трохі менш папулярнай стала практыка «адпачываць дома».

У залежнасці ад узросту рэспандэнтаў зафіксавана (гл. табл. 1):

рэспандэнты ва ўзросце 25—54 гады значна часцей сталі ўдзельнічаць у мерапрыемствах, якія праводзяцца грамадскімі арганізацыямі;

жыхары Беларусі ва ўзросце 40 і больш гадоў часцей выязджаюць на прыроду;

установы культуры сталі часцей наведваць асобы ва ўзросце 25—54 гады;

усе ўзроставыя групы сталі менш адпачываць дома;

асобы, старэйшыя за 40 гадоў сталі больш праводзіць вольны час у інтэрнэце;

рэспандэнты ад 25 да 39 гадоў сталі больш займацца спортам;

сталі часцей хадзіць у госці асобы ва ўзросце ад 40 да 54 гадоў.

*Табліца 1*

Дынаміка фактычных адпачынкавых практык
у розных узроставых групах, %

| Фактычныя адпачынкавыя практыкі | Да 24 гадоў | | 25—39 гадоў | | 40—54 гады | | 55 і больш гадоў | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. |
| Выязджаю на прыроду | 74,2 | 68,3 | 77,9 | 74,8 | 59,0 | 62,4 | 40,6 | 46,4 |
| Займаюся любімай справай (хобі) | 62,5 | 64,0 | 47,5 | 59,6 | 49,6 | 56,0 | 47,5 | 51,9 |
| Займаюся самаадукацыяй (курсы, трэнінгі і інш.) | 27,0 | 33,5 | 15,0 | 20,2 | 12,7 | 16,7 | 7,1 | 7,7 |
| Займаюся спортам (фітнесам) | 54,7 | 45,3 | 25,4 | 27,8 | 16,8 | 18,5 | 6,2 | 7,2 |
| Адпачываю дома | 81,3 | 78,4 | 84,5 | 82,1 | 86,3 | 81,8 | 91,4 | 83,3 |
| Наведваю ўстановы культуры (тэатры, музеі, канцэртныя залы, кіно) | 43,1 | 40,5 | 30,5 | 33,9 | 22,5 | 25,1 | 15,9 | 15,2 |
| Праводжу час у інтэрнэце | 83,5 | 81,0 | 60,7 | 67,3 | 25,4 | 41,8 | 5,1 | 12,8 |
| Удзельнічаю ў мерапрыемствах, якія праводзяцца грамадскімі арганізацыямі | 13,9 | 15,4 | 6,9 | 14,4 | 7,4 | 11,5 | 4,2 | 5,7 |
| Хаджу ў госці | 76,0 | 69,3 | 73,9 | 71,9 | 65,5 | 68,4 | 58,1 | 54,8 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У залежнасці ад тыпу населенага пункта варта адзначыць наступныя асаблівасці:

і гарадскія, і сельскія жыхары Рэспублікі Беларусь сталі значна больш актыўнымі. Гэта выяўляецца ў тым, што яны менш вольнага часу праводзяць дома, а выязджаюць на прыроду (у асноўным вяскоўцы), займаюцца любімай справай, самаадукацыяй (у асноўным гараджане);

вяскоўцы значна больш часу сталі праводзіць у інтэрнэце;

гараджане сталі больш удзельнічаць у мерапрыемствах, якія праводзяцца грамадскімі арганізацыямі, а таксама займацца спортам (гл. табл. 2).

*Табліца 2*

Дынаміка фактычных адпачынкавых практык
у залежнасці ад тыпу населенага пункта, %

| Фактычныя адпачынкавыя практыкі | Горад | | Сяло | |
|---|---|---|---|---|
| | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. |
| Выязджаю на прыроду | 64,9 | 66,2 | 49,5 | 58,7 |
| Займаюся любімай справай (хобі) | 51,2 | 59,5 | 49,2 | 53,3 |
| Займаюся самаадукацыяй (курсы, трэнінгі і інш.) | 15,4 | 21,6 | 10,3 | 13,2 |
| Займаюся спортам (фітнесам) | 25,1 | 28,4 | 14,5 | 13,7 |
| Адпачываю дома | 85,5 | 81,2 | 89,5 | 82,5 |
| Наведваю ўстановы культуры (тэатры, музеі, канцэртныя залы, кіно) | 29,8 | 33,9 | 15,3 | 14,5 |
| Праводжу час у інтэрнэце | 41,6 | 55,3 | 29,5 | 42,6 |
| Удзельнічаю ў мерапрыемствах, якія праводзяцца грамадскімі арганізацыямі | 7,9 | 12,9 | 6,1 | 9,6 |
| Хаджу ў госці | 67,2 | 67,2 | 67,4 | 66,5 |

У залежнасці ад гендэрнай прыналежнасці выяўлена, што ў вольны час:

жанчыны сталі:

значна часцей выязджаць на прыроду;

больш займацца самаадукацыяй;

мужчыны ў большай ступені арыентаваны на хобі;

і мужчыны, і жанчыны сталі:

больш увагі надаваць мерапрыемствам, якія праводзяцца грамадскімі арганізацыямі;

больш часу праводзіць у інтэрнэце і менш часу адпачываць дома.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Акрамя таго, была зафіксавана і ў мужчын, і ў жанчын станоўчая дынаміка ў наведванні ўстаноў культуры (гл. табл. 3).

*Табліца 3*

Дынаміка фактычных адпачынкавых практык
у залежнасці ад гендэрнай прыналежнасці, %

| Фактычныя адпачынкавыя практыкі | Мужчыны | | Жанчыны | |
|---|---|---|---|---|
| | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. |
| Выязджаю на прыроду | 67,1 | 67,1 | 55,8 | 61,8 |
| Займаюся любімай справай (хобі) | 52,7 | 60,7 | 48,9 | 55,5 |
| Займаюся самаадукацыяй (курсы, трэнінгі і інш.) | 14,2 | 16,8 | 14,0 | 22,0 |
| Займаюся спортам (фітнесам) | 29,1 | 29,2 | 16,7 | 20,7 |
| Адпачываю дома | 86,5 | 82,8 | 86,4 | 80,3 |
| Наведваю ўстановы культуры (тэатры, музеі, канцэртныя залы, кіно) | 21,5 | 26,0 | 30,2 | 32,0 |
| Праводжу час у інтэрнэце | 42,9 | 55,2 | 34,9 | 49,4 |
| Удзельнічаю ў мерапрыемствах, якія праводзяцца грамадскімі арганізацыямі | 7,3 | 10,1 | 7,6 | 13,8 |
| Хаджу ў госці | 64,7 | 65,9 | 69,6 | 68,0 |

Для вызначэння пажаданых адпачынкавых стратэгій паводзін рэспандэнтам прапаноўвалася адказаць на пытанне «Як Вы хацелі б праводзіць вольны час?». Варта заўважыць, што ў абодвух эмпірычных замерах зафіксавана разыходжанне паміж пажаданымі і фактычнымі адпачынкавымі практыкамі. Па выніках параўнальнага аналізу адзначаецца павышэнне патэнцыяльнай актыўнасці рэспандэнтаў, што выяўляецца ў наяўнасці жадання актыўна праводзіць вольны час. Так, у 2014 г. жыхары краіны ў большай ступені, чым раней, сталі праяўляюць цікавасць да такіх адпачынкавых форм, як удзел у грамадскіх мерапрыемствах, самаадукацыя, заняткі спортам (фітнесам), наведванне ўстаноў культуры (гл. мал. 2).

Найбольшую цікавасць выклікае павышэнне імкнення жыхароў Беларусі ўдзельнічаць у мерапрыемствах, што праводзяцца грамадскімі арганізацыямі. Гэтая тэндэнцыя найбольш праяўляецца ў прадстаўнікоў Гомельскай і Брэсцкай абласцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




*Мал. 2.* Дынаміка жаданых адпачынкавых практык па гадах

У залежнасці ад узроставай прыметы зафіксавана:

рэспандэнты ўсіх узроставых груп усё менш імкнуцца выязджаць на прыроду, займацца любімай справай, адпачываць дома, хадзіць у госці;

беларусы ва ўзросце 25 і больш гадоў сталі больш арыентавацца на самаадукацыю;

ва ўсіх узроставых групах імкненне больш часу надаваць заняткам спортам, наведванню культурна-асветных устаноў, а таксама ўдзельнічаць у грамадскіх мерапрыемствах;

рэспандэнты ад 55 і больш гадоў выказваюць вострае жаданне праводзіць час у інтэрнэце (гл. табл. 4).

*Табліца 4*

Дынаміка пажаданых адпачынкавых практык у розных узроставых групах, %

| Пажаданыя адпачынкавыя практыкі | Да 24 гадоў | | 25—39 гадоў | | 40—54 гады | | 55 і больш гадоў | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. |
| Выезд на прыроду | 49,4 | 39,5 | 54,0 | 31,3 | 57,1 | 40,0 | 53,0 | 39,3 |
| Заняткі любімай справай (хобі) | 43,6 | 31,3 | 42,9 | 33,2 | 38,0 | 31,4 | 36,4 | 31,9 |
| Заняткі самаадукацыяй (курсы, трэнінгі і інш.) | 52,7 | 50,2 | 41,8 | 59,3 | 34,8 | 51,9 | 26,0 | 46,9 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Заканчэнне табл. 4*

| Пажаданыя адпачынкавыя практыкі | Да 24 гадоў | | 25—39 гадоў | | 40—54 гады | | 55 і больш гадоў | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. |
| Заняткі спортам (фітнесам) | 50,2 | 51,0 | 49,3 | 58,2 | 43,4 | 57,5 | 24,4 | 46,8 |
| Адпачынак дома | 31,7 | 16,3 | 38,2 | 15,8 | 36,4 | 19,3 | 49,4 | 29,8 |
| Наведванне ўстаноў культуры (тэатраў, музеяў, канцэртных залаў, кіно) | 50,2 | 52,7 | 51,3 | 53,2 | 48,8 | 51,5 | 38,4 | 49,8 |
| Правядзенне вольнага часу ў інтэрнэце | 29,2 | 21,8 | 28,1 | 23,7 | 28,6 | 27,9 | 17,7 | 40,7 |
| Удзел у мерапрыемствах, якія праводзяцца грамадскімі арганізацыямі | 27,6 | 51,6 | 22,0 | 49,2 | 19,9 | 44,9 | 16,6 | 43,8 |
| Паходы ў госці | 35,0 | 28,5 | 39,6 | 20,1 | 38,8 | 18,9 | 41,3 | 27,8 |

У залежнасці ад тыпу населенага пункта і ў гараджан, і ў вяскоўцаў адзначаецца імкненне больш часу надаваць самаадукацыі, спорту, наведванню ўстаноў культуры, удзелу ў мерапрыемствах, якія праводзяцца грамадскімі арганізацыямі. З іншага боку, адмоўная дынаміка і ў мужчын, і ў жанчын зафіксавана адносна такіх адпачынкавых практык, як паходы ў госці і адпачынак дома. Варта таксама адзначыць, што вяскоўцы ў адрозненне ад гараджан выказалі жаданне больш часу ўдзяляць любімай справе і інтэрнэту (гл. табл. 5).

*Табліца 5*

Дынаміка пажаданых адпачынкавых практык
у залежнасці ад тыпу населенага пункта, %

| Пажаданыя адпачынкавыя практыкі | Горад | | Сяло | |
|---|---|---|---|---|
| | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. |
| Выезд на прыроду | 54,5 | 36,9 | 51,3 | 37,2 |
| Заняткі любімай справай (хобі) | 42,3 | 30,2 | 31,6 | 37,2 |
| Заняткі самаадукацыяй (курсы, трэнінгі і да т.п.) | 39,7 | 53,8 | 29,4 | 50,6 |
| Заняткі спортам (фітнесам) | 43,2 | 54,0 | 32,9 | 55,4 |
| Адпачынак дома | 39,3 | 17,3 | 41,1 | 25,3 |



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Заканчэнне табл. 5*

| Пажаданыя адпачынкавыя практыкі | Горад | | Сяло | |
|---|---|---|---|---|
| | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. |
| Наведванне ўстаноў культуры (тэатраў, музеяў, канцэртных залаў, кіно) | 47,8 | 50,5 | 43,4 | 56,2 |
| Правядзенне часу ў інтэрнэце | 26,7 | 25,4 | 21,5 | 33,7 |
| Удзел у мерапрыемствах, якія праводзяцца грамадскімі арганізацыямі | 22,1 | 47,6 | 17,1 | 47,2 |
| Паходы ў госці | 39,4 | 21,5 | 37,7 | 27,0 |

Пры разглядзе гендэрнай прыналежнасці рэспандэнта адзначалася, што і ў мужчын, і ў жанчын адмоўная дынаміка ў дачыненні да наступных пажаданых адпачынкавых практык: выезд на прыроду, заняткі любімай справай, адпачынак дома, паходы ў госці. З іншага боку, станоўчыя тэндэнцыі выяўлены ў адносінах да наступных формаў: самаадукацыя, наведванне ўстаноў культуры і ўдзел у мерапрыемствах, якія праводзяцца грамадскімі арганізацыямі (гл. табл. 6).

*Табліца 6*

Дынаміка пажаданых адпачынкавых практык
у залежнасці ад гендэрнай прыналежнасці, %

| Пажаданыя адпачынкавыя практыкі | Мужчыны | | Жанчыны | |
|---|---|---|---|---|
| | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. |
| Выезд на прыроду | 53,5 | 38,0 | 54,0 | 36,0 |
| Заняткі любімай справай (хобі) | 38,6 | 32,2 | 40,6 | 31,9 |
| Заняткі самаадукацыяй (курсы, трэнінгі і інш.) | 34,5 | 52,6 | 39,6 | 53,3 |
| Заняткі спортам (фітнесам) | 38,9 | 49,6 | 42,4 | 58,7 |
| Адпачынак дома | 40,8 | 22,4 | 38,9 | 16,8 |
| Наведванне ўстаноў культуры (тэатраў, музеяў, канцэртных залаў, кіно) | 41,7 | 49,5 | 50,9 | 54,2 |
| Правядзенне часу ў інтэрнэце | 26,9 | 27,4 | 24,5 | 27,7 |
| Удзел у мерапрыемствах, якія праводзяцца грамадскімі арганізацыямі | 19,8 | 47,1 | 21,8 | 47,9 |
| Паходы ў госці | 38,4 | 25,3 | 39,3 | 20,8 |

Даныя праведзеных сацыялагічных даследаванняў сведчаць, што ў 2014 г. рэспандэнты сталі больш актыўна наведваць усе ўстановы культуры і спорту (гл. мал. 3).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




*Мал. 3.* Наведванне ўстаноў культуры і спорту (%)

У залежнасці ад узросту рэспандэнтаў ва ўсіх узроставых групах павялічылася колькасць наведвальнікаў тэатраў і канцэртных залаў. Адзначаецца таксама павелічэнне колькасці наведвальнікаў музеяў, спартыўных залаў і бібліятэк ва ўзросце ад 25 і больш гадоў (гл. табл. 7).

*Табліца 7*

Дынаміка наведвання ўстаноў культуры і спорту
ў розных узроставых групах, %

| | Да 24 гадоў | | 25—39 гадоў | | 40—54 гады | | 55 і больш гадоў | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. |
| Музей | 53,8 | 50,5 | 37,8 | 50,7 | 35,1 | 48,9 | 20,0 | 29,7 |
| Тэатр | 46,6 | 51,4 | 43,0 | 46,0 | 37,1 | 45,6 | 22,2 | 29,9 |
| Кінатэатр | 83,7 | 79,6 | 59,6 | 67,3 | 35,1 | 46,6 | 13,9 | 20,9 |
| Бібліятэка | 53,8 | 51,8 | 28,9 | 36,7 | 34,0 | 43,6 | 20,4 | 26,8 |
| Парк адпачынку, парк з атракцыёнамі | 87,5 | 84,4 | 78,2 | 77,6 | 62,4 | 70,9 | 37,9 | 47,6 |
| Спартыўная зала, басейн | 76,4 | 76,0 | 43,6 | 51,6 | 27,1 | 35,4 | 6,7 | 15,8 |
| Канцэртная зала | 57,2 | 64,2 | 43,6 | 50,3 | 42,5 | 50,9 | 23,3 | 30,8 |
| Клуб (заняткі па інтарэсах) | 22,1 | 13,7 | 11,5 | 10,8 | 8,2 | 9,0 | 7,0 | 9,3 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Атрыманыя ў час даследаванняў даныя дазволілі зафіксаваць павелічэнне колькасці наведвальнікаў паркаў адпачынку ва ўзросце больш за 40 гадоў. З іншага боку, неабходна адзначыць значнае змяншэнне колькасці наведвальнікаў клубаў па інтарэсах ва ўзросце да 24 гадоў.

У залежнасці ад тыпу населенага пункта зафіксавана станоўчая дынаміка ў наведванні ўстаноў культуры і спорту. Найбольш значныя змены ў вяскоўцаў зафіксаваныя адносна наведванняў бібліятэк і канцэртных залаў, у гараджан — кінатэатраў і спартыўных залаў (гл. табл. 8).

*Табліца 8*

Дынаміка наведвання ўстаноў культуры і спорту
ў залежнасці ад тыпу населенага пункта, %

| Установы | Горад | | Сяло | |
|---|---|---|---|---|
| | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. |
| Музей | 37,2 | 51,2 | 23,5 | 29,8 |
| Тэатр | 40,5 | 50,3 | 19,9 | 23,9 |
| Кінатэатр | 45,6 | 59,1 | 30,5 | 37,7 |
| Бібліятэка | 32,9 | 37,9 | 26,9 | 43,5 |
| Парк адпачынку, парк з атракцыёнамі | 67,6 | 76,0 | 46,8 | 54,5 |
| Спартыўная зала, басейн | 35,7 | 49,3 | 21,6 | 27,5 |
| Канцэртная зала | 42,4 | 51,4 | 28,6 | 41,3 |
| Клуб (заняткі па інтарэсах) | 10,7 | 10,5 | 10,6 | 10,4 |

У залежнасці ад гендэрнай прыналежнасці адзначаецца станоўчая дынаміка і ў мужчын, і ў жанчын у наведванні музеяў, кінатэатраў і спартыўных залаў. У жанчын зафіксавана вялікая ў параўнанні з мужчынамі дынаміка наведвання бібліятэк і паркаў адпачынку (гл. табл. 9).

*Табліца 9*

Дынаміка наведвання ўстаноў культуры і спорту
ў залежнасці ад гендэрнай прыналежнасці, %

| Установы | Мужчыны | | Жанчыны | |
|---|---|---|---|---|
| | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. |
| Музей | 27,2 | 41,0 | 39,3 | 49,9 |
| Тэатр | 29,3 | 37,4 | 40,4 | 49,0 |
| Кінатэатр | 43,2 | 53,6 | 40,4 | 53,5 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Заканчэнне табл. 9*

| Установы | Мужчыны | | Жанчыны | |
|---|---|---|---|---|
| | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. |
| Бібліятэка | 25,7 | 31,2 | 36,3 | 47,0 |
| Парк адпачынку, парк з атракцыёнамі | 61,0 | 67,4 | 63,2 | 73,3 |
| Спартыўная зала, басейн | 38,7 | 48,8 | 26,3 | 38,8 |
| Канцэртная зала | 33,6 | 44,2 | 43,2 | 53,1 |
| Клуб, дзе праходзяць заняткі па інтарэсах | 12,2 | 9,0 | 9,5 | 11,9 |

Параўнальны аналіз ацэнак рэспандэнтамі значнасці розных характарыстык пры выбары форм правядзення вольнага часу сведчыць, што ў 2014 г. знізілася значнасць характарыстык, але іерархія якасцей сур'ёзна не змянілася (гл. мал. 4).




*Мал. 4.* Ацэнка рэспандэнтамі значнасці характарыстык пры выбары форм правядзення вольнага часу (сярэдні бал ад 1 да 5)

У залежнасці ад узросту зафіксавана тая ж адметнасць: зменшылася ацэнка значнасці ўсіх характарыстык вольнага часу (гл. табл. 10).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табліца 10*

Ацэнка рэспандэнтамі значнасці характарыстык
пры выбары форм правядзення вольнага часу
ў розных узроставых групах (сярэдні бал ад 1 да 5)

| | Да 24 гадоў | | 25—39 гадоў | | 40—54 гады | | 55 і больш гадоў | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. |
| Магчымасць нічога не рабіць, адпачыць | 3,80 | 3,19 | 3,99 | 3,02 | 3,95 | 3,11 | 4,19 | 3,11 |
| Магчымасць атрымаць новыя веды, пашырыць кругагляд | 3,97 | 3,62 | 4,04 | 3,56 | 3,83 | 3,49 | 3,88 | 2,99 |
| Магчымасць палепшыць сваё здароўе, падтрымліваць добрую фізічную форму | 4,48 | 4,03 | 4,47 | 3,95 | 4,38 | 3,96 | 4,48 | 3,70 |
| Магчымасць прынесці карысць грамадству | 3,45 | 3,08 | 3,50 | 3,20 | 3,52 | 2,98 | 3,71 | 2,98 |
| Магчымасць далучыцца да мастацтва, атрымаць эстэтычную асалоду | 3,66 | 3,04 | 3,54 | 2,94 | 3,61 | 3,06 | 3,93 | 2,77 |
| Магчымасць павесяліцца | 4,54 | 4,07 | 4,20 | 3,53 | 3,76 | 3,20 | 3,63 | 2,61 |

У залежнасці ад тыпу населенага пункта зафіксаваныя адрозненні: як у гараджан, так і ў вяскоўцаў адзначаецца паніжэнне ацэнак усіх прапанаваных крытэрыяў вольнага часу (гл. табл. 11).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табліца 11*

Ацэнка рэспандэнтамі значнасці характарыстык пры выбары форм правядзення вольнага часу ў залежнасці ад тыпу населенага пункта (сярэдні бал ад 1 да 5)

| | Горад | | Сяло | |
|---|---|---|---|---|
| | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. |
| Магчымасць нічога не рабіць, адпачыць | 3,95 | 3,08 | 4,18 | 3,16 |
| Магчымасць атрымаць новыя веды, пашырыць кругагляд | 3,88 | 3,49 | 4,06 | 3,28 |
| Магчымасць палепшыць сваё здароўе, падтрымліваць добрую фізічную форму | 4,44 | 3,98 | 4,47 | 3,74 |
| Магчымасць прынесці карысць грамадству | 3,48 | 3,12 | 3,82 | 2,90 |
| Магчымасць далучыцца да мастацтва, атрымаць эстэтычную асалоду | 3,63 | 3,02 | 3,90 | 2,78 |
| Магчымасць павесяліцца | 3,94 | 3,43 | 4,08 | 3,17 |

Тая ж асаблівасць зафіксавана ў залежнасці ад гендэрнай прыналежнасці рэспандэнтаў (гл. табл. 12).

*Табліца 12*

Ацэнка рэспандэнтамі значнасці характарыстык пры выбары форм правядзення вольнага часу ў залежнасці ад гендэрнай прыналежнасці (сярэдні бал ад 1 да 5)

| | Мужчыны | | Жанчыны | |
|---|---|---|---|---|
| | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. |
| Магчымасць нічога не рабіць, адпачыць | 4,05 | 3,15 | 3,97 | 3,05 |
| Магчымасць атрымаць новыя веды, пашырыць кругагляд | 3,81 | 3,32 | 4,02 | 3,55 |
| Магчымасць палепшыць сваё здароўе, падтрымліваць добрую фізічную форму | 4,35 | 3,82 | 4,54 | 4,01 |
| Магчымасць прынесці карысць грамадству | 3,61 | 2,91 | 3,51 | 3,21 |
| Магчымасць далучыцца да мастацтва, атрымаць эстэтычную асалоду | 3,57 | 2,68 | 3,80 | 3,22 |
| Магчымасць павесяліцца | 4,14 | 3,40 | 3,83 | 3,33 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асаблівая ўвага ў час правядзення даследавання была нададзена матэрыяльнай частцы вывучаемай праблематыкі, паколькі эканамічныя фактары дазваляюць пашырыць альбо абмежаваць доступ да тых ці іншых адпачынкавых практык. Вызначальным для гэтага паказчыка стала пытанне «Ці дастаткова Вам грашовых сродкаў для правядзення вольнага часу?». Даныя праведзеных сацыялагічных даследаванняў сведчаць, што ў 2014 г. павялічылася колькасць рэспандэнтаў, якія адзначаюць задаволенасць наяўнымі фінансавымі сродкамі для правядзення вольнага часу. З іншага боку, зафіксавана змяншэнне колькасці рэспандэнтаў, якім для правядзення вольнага часу наяўнасць грошай не абавязкова (гл. мал. 5).




*Мал. 5.* Размеркаванне адказаў на пытанне
«Ці дастаткова Вам грашовых сродкаў для правядзення вольнага часу?»

Дадзеная асаблівасць характэрна для ўсіх узроставых груп. Трэба адзначыць, што ў групе ад 55 і больш гадоў колькасць рэспандэнтаў, якім для правядзення вольнага часу фінансавыя сродкі не патрэбны, найбольшая, хаця ў параўнанні з 2013 г. іх колькасць у 2014 г. значна зменшылася. З іншага боку, большасць незадаволеных наяўнымі матэрыяльнымі рэсурсамі знаходзяцца ў групе да 24 гадоў, разам з тым у гэтай узроставай катэгорыі незадаволеных становіцца менш (гл. табл. 13).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табліца 13*

Задаволенасць наяўнымі фінансавымі сродкамі
для правядзення вольнага часу, %

| Ці дастаткова Вам грашовых сродкаў для правядзення вольнага часу? | Да 24 гадоў | | 25—39 гадоў | | 40—54 гады | | 55 і больш гадоў | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. |
| Так | 9,4 | 15,7 | 9,5 | 13,4 | 8,8 | 11,9 | 6,2 | 17,8 |
| Хутчэй, так | 21,4 | 36,1 | 29,9 | 30,9 | 27,4 | 35,7 | 19,6 | 27,8 |
| Хутчэй, не | 38,7 | 26,9 | 32,0 | 29,6 | 27,6 | 25,2 | 15,7 | 17,0 |
| Не | 22,6 | 18,6 | 19,9 | 19,8 | 18,8 | 18,7 | 15,9 | 13,8 |
| Для правядзення вольнага часу наяўнасць грошай не абавязкова | 7,9 | 2,7 | 8,7 | 6,4 | 17,4 | 8,5 | 42,6 | 23,6 |

Даныя праведзеных сацыялагічных даследаванняў сведчаць, што як мужчыны, так і жанчыны дэманструюць станоўчую дынаміку задаволенасці наяўнымі фінансавымі сродкамі для правядзення вольнага часу. З іншага боку, варта адзначыць, што колькасць незадаволеных у той ці іншай ступені большая, чым колькасць задаволеных, асабліва сярод жанчын (гл. табл. 14).

*Табліца 14*

Задаволенасць наяўнымі фінансавымі сродкамі для правядзення вольнага часу
ў залежнасці ад гендэрнай прыналежнасці, %

| Ці дастаткова Вам грашовых сродкаў для правядзення вольнага часу? | Мужчыны | | Жанчыны | |
|---|---|---|---|---|
| | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. |
| Так | 11,1 | 16,6 | 6,0 | 12,2 |
| Хутчэй, так | 25,6 | 35,4 | 23,9 | 30,1 |
| Хутчэй, не | 26,6 | 21,7 | 27,4 | 28,6 |
| Не | 16,3 | 15,7 | 21,1 | 20,3 |
| Для правядзення вольнага часу наяўнасць грошай не абавязкова | 20,4 | 10,6 | 21,5 | 8,7 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У залежнасці ад тыпу населенага пункта колькасць задаволеных фінансавымі магчымасцямі павялічылася, аднак у цэлым ступень незадаволенасці застаецца, асабліва ў гарадскім асяроддзі (гл. табл. 15).

*Табліца 15*

Задаволенасць наяўнымі фінансавымі сродкамі
для правядзення вольнага часу
ў залежнасці ад тыпу населенага пункта, %

| Ці дастаткова Вам грашовых сродкаў для правядзення вольнага часу? | Горад | | Сяло | |
|---|---|---|---|---|
| | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. |
| Так | 9,0 | 14,6 | 6,1 | 13,6 |
| Хутчэй, так | 26,5 | 32,7 | 19,1 | 32,8 |
| Хутчэй, не | 27,1 | 27,2 | 27,1 | 19,2 |
| Не | 19,5 | 17,9 | 17,0 | 18,4 |
| Для правядзення вольнага часу наяўнасць грошай не абавязкова | 17,8 | 7,5 | 30,8 | 16,0 |

У сувязі з тым, што працэнт рэспандэнтаў, якія адказалі адмоўна на пытанне «Ці дастаткова Вам грашовых сродкаў для правядзення вольнага часу?», высокі, аўтарскім калектывам былі распрацаваны магчымыя варыянты стратэгій паводзін рэспандэнтаў у дадзенай сітуацыі:

1. Актывісцкая стратэгія — наяўнасць грошай і правядзенне вольнага часу па раней вызначанаму плану;

2. Адаптацыйная стратэгія — пошук альтэрнатыўных варыянтаў правядзення вольнага часу, прымальных па цане;

3. Рэгрэсіўная стратэгія — замена на такі від правядзення вольнага часу, які не патрабуе матэрыяльных выдаткаў.

Даныя праведзеных сацыялагічных даследаванняў сведчаць, што колькасць рэспандэнтаў, якія прытрымліваюцца рэгрэсіўнай эканамічнай стратэгіі адпачынкавых паводзін, павялічылася (гл. мал. 6).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




*Мал. 6*. Дынаміка эканамічных стратэгій адпачынкавых паводзін па гадах

Варта адзначыць, што ва ўсіх узроставых групах:

зменшылася колькасць рэспандэнтаў, якія прытрымліваюцца актывісцкай эканамічнай стратэгіі адпачынкавых паводзін;

адзначаецца адмоўная дынаміка адносна адаптацыйнай эканамічнай стратэгіі адпачынкавых паводзін (асабліва ярка гэта праявілася ў групе ад 55 і больш гадоў);

зафіксавана павелічэнне колькасці асоб, якія ў выпадку матэрыяльных цяжкасцей замяняюць пажаданы адпачынак на такі від правядзення вольнага часу, што не патрабуе матэрыяльных выдаткаў. Асабліва ярка дадзеная тэндэнцыя прасочваецца ў самай малодшай і самай старэйшай узроставых групах (гл. табл. 16).

*Табліца 16*

Дынаміка эканамічных стратэгій адпачынкавых паводзін у розных узроставых групах, %

| Назва | Да 24 гадоў | | 25—39 гадоў | | 40—54 гады | | 55 і больш гадоў | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. |
| Актывісцкая эканамічная стратэгія адпачынкавых паводзін | 21,5 | 15,5 | 16,4 | 10,8 | 15,0 | 10,3 | 6,7 | 5,9 |
| Адаптацыйная эканамічная стратэгія адпачынкавых паводзін | 57,9 | 50,7 | 52,2 | 50,4 | 44,5 | 41,4 | 34,4 | 22,6 |
| Рэгрэсіўная эканамічная стратэгія адпачынкавых паводзін | 20,6 | 33,8 | 31,5 | 38,8 | 40,5 | 48,3 | 58,9 | 71,5 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У залежнасці ад тыпу населенага пункта зафіксавана, што колькасць прыхільнікаў актывісцкай эканамічнай стратэгіі адпачынкавых паводзін зменшылася ў групе гараджан. З іншага боку, варта адзначыць, што дынаміка росту папулярнасці рэгрэсіўнай стратэгіі паводзін выяўлена ў большай ступені ў гарадскім асяроддзі (гл. табл. 17).

*Табліца 17*

Дынаміка эканамічных стратэгій адпачынкавых паводзін
у залежнасці ад тыпу населенага пункта, %

| Назва | Горад | | Сяло | |
|---|---|---|---|---|
| | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. |
| Актывісцкая эканамічная стратэгія адпачынкавых паводзін | 15,4 | 10,3 | 11,9 | 12,3 |
| Адаптацыйная эканамічная стратэгія адпачынкавых паводзін | 48,5 | 45,3 | 40,6 | 35,7 |
| Рэгрэсіўная эканамічная стратэгія адпачынкавых паводзін | 36,1 | 44,4 | 47,5 | 52,0 |

У межах гендэрнай прыналежнасці сур'ёзных адрозненняў не выяўлена, адзначаецца рост папулярнасці рэгрэсіўнай эканамічнай стратэгіі адпачынкавых паводзін сярод жанчын за кошт змяншэння распаўсюджанасці адаптацыйнай стратэгіі (гл. табл. 18).

*Табліца 18*

Дынаміка эканамічных стратэгій адпачынкавых паводзін
у розных гендэрных групах, %

| Назва | Мужчыны | | Жанчыны | |
|---|---|---|---|---|
| | 2013 г. | 2014 г. | 2013 г. | 2014 г. |
| Актывісцкая эканамічная стратэгія адпачынкавых паводзін | 18,5 | 13,9 | 11,6 | 8,3 |
| Адаптацыйная эканамічная стратэгія адпачынкавых паводзін | 47,9 | 47,1 | 45,8 | 40,0 |
| Рэгрэсіўная эканамічная стратэгія адпачынкавых паводзін | 33,6 | 39,0 | 42,6 | 51,7 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, праведзены параўнальны аналіз стратэгій адпачынкавых паводзін сацыяльна-дэмаграфічных і тэрытарыяльных груп дазволіў зрабіць наступныя высновы:

1. Адзначаецца нязначнае павышэнне актыўнасці жыхароў Беларусі ў правядзенні вольнага часу. Рэспандэнты сталі больш займацца любімай справай, самаадукацыяй, удзельнічаць у грамадскіх мерапрыемствах, наведваць установы культуры. Менш папулярнай стала практыка «адпачынак дома».

2. Эмпірычныя замеры зафіксавалі разыходжанне паміж пажаданымі і фактычнымі адпачынкавымі практыкамі. Па выніках параўнальнага аналізу варта адзначыць павышэнне патэнцыяльнай актыўнасці рэспандэнтаў, што выявілася ў наяўнасці жадання актыўна праводзіць вольны час. Жыхары краіны праявілі цікавасць да такіх форм адпачынку, як удзел у грамадскіх мерапрыемствах, самаадукацыя, заняткі спортам (фітнесам), наведванне ўстаноў культуры.

3. Даныя праведзеных сацыялагічных даследаванняў сведчаць, што рэспандэнты сталі больш актыўна наведваць усе ўстановы культуры і спорту. Ва ўсіх узроставых групах павялічылася колькасць наведвальнікаў тэатраў і канцэртных залаў, а таксама колькасць наведвальнікаў музеяў, спартыўных залаў і бібліятэк (ад 25 і больш гадоў). Зафіксавана станоўчая дынаміка ў наведванні ўстаноў культуры і спорту ў залежнасці ад тыпу населенага пункта. Найбольш значныя змены ў вяскоўцаў зафіксаваны адносна наведвання бібліятэк і канцэртных залаў, у гараджан — кінатэатраў і спартыўных залаў. З пункту гледжання гендэрнай прыналежнасці выяўлена станоўчая дынаміка і ў мужчын, і ў жанчын у наведванні музеяў, кінатэатраў і спартыўных залаў. У жанчын зафіксавана большая, у параўнанні з мужчынамі, дынаміка наведвання бібліятэк і паркаў адпачынку.

4. Параўнальны аналіз ацэнак рэспандэнтамі значнасці розных характарыстык пры выбары правядзення вольнага часу сведчыць, што знізілася значнасць усіх характарыстык, аднак іерархія якасцей сур'ёзна не змянілася.

5. Павялічылася колькасць рэспандэнтаў, якія адзначаюць задаволенасць наяўнымі фінансавымі сродкамі для правядзення вольнага часу. З іншага боку, зафіксавана змяншэнне колькасці тых, каму для правядзення вольнага часу наяўнасць грошай не абавязкова.

6. За даследаваны перыяд павялічылася колькасць рэспандэнтаў, якія прытрымліваюцца рэгрэсіўнай эканамічнай стратэгіі адпачынкавых паводзін. Зафіксавана, што ў залежнасці ад тыпу населенага пункта колькасць прыхільнікаў актывісцкай эканамічнай стратэгіі адпачынкавых паводзін зменшылася ў групе гараджан. З іншага боку, варта адзначыць, што дынаміка росту папулярнасці рэгрэсіўнай стратэгіі паводзін выяўлена ў большай ступені ў гарадскім асяроддзі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ